ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
26
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 8 (1308)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## ГОЛАС ЭПОХІ

ВЯКОЎ БЯСКОНЦАСЦЬ
НА СВАІХ ПЛЯЧАХ
НЯСЕ ЗЯМЛЯ ІМКЛІВАСЦЮ
АРБІТЫ.
НА ЁЙ У ЦЭНТРЫ
НАШ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ
ГАРЫЦЬ ЗАРОЙ,
СВЯТОЙ КРЫВЁЙ ПАЛІТЫ.
ЁН БАЧНЫ ЎСІМ ПРАЗ
ВЁРСТЫ,
ДАЛЯЧЫНЬ,
ЯК БАЧНЫ НАМ
У ЦЁМНЫМ НЕБЕ ЗОРЫ.
І ЛЮДЗІ СЛЫХ
НАПРУЖВАЮЦЬ:
АБ ЧЫМ
З НАРОДАМ НАША ПАРТЫЯ
ГАВОРЫЦЬ.
ЯНА АБ ТЫМ —
ЯК ЗДАБЫВАЦЬ МЕТАЛ,
ВЫРОШЧВАЦЬ ХЛЕБ,
КАБ ЛЮДЗЯМ ЛЕПШ
ЖЫЛОСЯ,
КАБ НАМ ЛЮБЫ АДУЖАЦЬ
ПЕРАВАЛ,
УСЁ Ў ЖЫЦЦІ КАБ СВЕТЛАЕ
ЗБЫЛОСЯ.
КРАЙ РОДНЫ!
ТУТ НАМ ДАРАГОЕ ЎСЁ —
ЯГО ЛЯСЫ, ПАЛЕТКІ, ГОРЫ,
НЕТРЫ.
З АБЛІЧЧАМ НОВЫХ
ГАРАДОЎ І СЁЛ
ЁН СТАЎ ДЛЯ НАС
ЖЫЦЦЁМ, КРЫВЁЙ,
ПАВЕТРАМ.
У КОЖНЫМ СЛОВЕ ПАРТЫІ
СВАЁЙ
МЫ ЧУЕМ КЛОПАТ ПРА
ЖЫЦЦЁ
ЛЮДСКОЕ.
СТАЯЛІ МЫ ЗАЎСЁДЫ
РАЗАМ З ЁЙ
ЗА ПРАВА ЖЫЦЬ—
ЗА САМАЕ СВЯТОЕ.
ЗА МАЛАДЫЯ ВЁСНЫ,
ЗА САДЫ,
ШТО АСЫПАЮЦЬ БЕЛЫ ПАХ
МЯЦЕЛІЦ.
ЗА ЯСНАСЦЬ ЗОР У
КОСМАСЕ, КУДЫ
І НАШЫ ПЕСНІ Ў СЭРЦАХ
ДАЛЯЦЕЛІ.
КАЛІ БЫЛО ПА ДВАЦЦАЦЬ
НАМ ГАДОЎ,
МЫ ЎЖО Ў АТАКІ РОТЫ
ПАДЫМАЛІ.
І НЕ ЗАБУДЗЕМ БАЯВЫХ
СЯБРОЎ,
ШТО ЗА РАДЗІМУ Ў БІТВАХ
ПАМІРАЛІ.
ШЛЯХ ПАРТЫІ —
ТО ШЛЯХ І МОЙ, І ТВОЙ,
ВЫСОКІ ПОДЗВІГ І ЖЫЦЦЁ
НАРОДА.
ЗА ПРАВА ЖЫЦЬ —
СТАІМ МЫ ЎСЁЙ ДУШОЙ
З ЛЮБОЎЮ ТОЙ,
ШТО ДАДЗЕНА АД РОДУ.
ГАРНЯК, АРАТЫ, БУДАЎНІК,
БАЕЦ —
УСЕ, ХТО РОДНУЮ ЗЯМЛЮ
ШАНУЕ,
МЫ ЗА РАШЭННІ, ПАРТЫЯ,
ТВАЕ,
У ІХ СВАЁЙ ЭПОХІ ГОЛАС
ЧУЕМ.
ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ ТАК
НАВУЧЫМ ЖЫЦЬ—
КАБ НЕ СКАРЫЛІСЯ Ў
ЖЫЦЦІ НІКОЛІ.
МЫ БУДЗЕМ ГЭТЫМ ПРАВАМ
ДАРАЖЫЦЬ,
ПАКУЛЬ ІДЗЁМ
ПАД СЦЯГАМ НАШАЙ
ВОЛІ.

**У МАСКВЕ ПРАЦЯГВАЕ СВАЮ РАБОТУ XXVI З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА. ЁН — ПАДЗЕЯ ВЯЛІКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ВАЖНАСЦІ, ЗНАМЯНАЛЬНАЯ ВЯХА НА ШЛЯХУ НАШАГА ГРАМАДСТВА ДА КАМУНІЗМУ, СВЕДЧАННЕ НЕПАРУШНАГА АДЗІНСТВА ПАРТЫІ І НАРОДА.**




# РАПАРТ

## КАЛЕКТЫВУ БДУ імя У. І. ЛЕНІНА XXVI З'ЕЗДУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

XXVI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна сустракае з пачуццём гонару за нашу вялікую сацыялістычную Радзіму. Вучоныя, студэнты і аспіранты, рабочыя і служачыя БДУ імя У. І. Леніна аднадушна адабраюць унутраную і знешнюю палітыку нашай роднай ленінскай партыі і Савецкай дзяржавы.

Выконваючы гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, у адказ на бацькоўскі клопат партыі і ўрада аб развіцці вышэйшай школы і навукі калектыў універсітэта ў выніку арганізатарскай і палітычнай работы рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзных арганізацый дабіўся новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, значна расшырыў фронт навуковых даследаванняў, павысіў эфектыўнасць укаранення дасягненняў навукі ў вытворчасць.

Праведзена значная работа па ўдасканаленню вучэбнага працэсу. Выдадзена больш чым 360 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Трывала ўвайшлі ў жыццё новыя формы выхаваўчай работы — Ленінскія залікі, ленінскія ўрокі, грамадска-палітычная практыка. Павышаны інтарэс праяўляюць студэнты універсітэта да грамадскіх навук, вывучэння ленінскай тэарэтычнай спадчыны, гістарычнага вопыту КПСС, да тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва.

За гады дзесятай пяцігодкі ва універсітэце падрыхтавана больш чым 14 тысяч маладых спецыялістаў, перакананых барацьбітоў за ідэалы камунізму, якія паспяхова працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, асветы і культуры.

Мінулыя гады сталі для універсітэта важным этапам у развіцці навукі. Вучонымі універсітэта ўнесены істотны ўклад у развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў. За пяцігодку імі абаронена 12 доктарскіх і 249 кандыдацкіх дысертацый, апублікавана больш як 250 манаграфій, амаль 11 тысяч навуковых артыкулаў. Агульны аб'ём друкаванай прадукцыі перавысіў 7 тысяч аўтарскіх аркушаў. Упершыню ў гісторыі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі зарэгістравана адкрыццё (1980 год) у галіне нейтроннай фізікі. Атрыманы 4 патэнты, 14 рэспубліканскіх прэмій, 104 медалі і дыпломы ВДНГ СССР і ВДНГ БССР, 632 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, у тым ліку 363 за два апошнія гады пяцігодкі. У 1980 годзе дзве работы маладых вучоных удастоены прэмій Ленінскага камсамола Беларусі.

Актыўны ўдзел у творчым навуковым пошуку прымаюць студэнты. Амаль 80 працэнтаў з іх пастаянна працуюць у навукова-даследчых гуртках, студэнцкіх лабараторыях і канструктарскіх бюро. Больш чым 1200 студэнцкіх навуковых работ адзначаны на ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах.

Кіруючыся запаветамі У. І. Леніна, моладзь універсітэта паспяхова спалучае вучобу з актыўным удзелам у грамадска карыснай працы. У студэнцкім будаўнічым руху за гады дзесятай пяцігодкі прыняло ўдзел больш чым 12 тысяч чалавек. Імі асвоена 32 мільёны рублёў капіталаўкладанняў. Толькі ў 1980 годзе зводны студэнцкі будаўнічы атрад асвоіў каля 10 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, здаў у эксплуатацыю 92 аб'екты, з якіх 28 — са студэнцкім знакам якасці. Узведзены і рэстаўрыраваны 73 помнікі і абеліскі, прачытана звыш 1700 лекцый, дадзена больш як 1000 канцэртаў.

Зыходзячы з рашэнняў Кастрычніцкага (1980 г.) Пленума ЦК КПСС, задач, выкладзеных у выступленнях Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, ідучы насустрач XXVI з'езду КПСС, калектыў універсітэта прыняў на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, якія выканаў датэрмінова.

Сведчаннем напружанай работы універсітэта з'яўляецца прысуджэнне яго калектыву двойчы — па выніках 1979 і 1980 гадоў — пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Саюза ССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Выкладчыкі і студэнты, рабочыя і служачыя універсітэта ў абстаноўцы высокага палітычнага і працоўнага ўздыму шырока абмеркавалі і аднадушна адобрылі праект ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года».

Горача і сардэчна вітаючы дэлегатаў XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, выкладчыкі, студэнты і супрацоўнікі універсітэта запэўніваюць Цэнтральны Камітэт КПСС, Савецкі ўрад і асабіста Леаніда Ільіча Брэжнева — выдатнага барацьбіта за мір і шчасце ўсіх людзей планеты, што не пашкадуюць сіл, ведаў і вопыту для здзяйснення азораных бессмяротным марксісцка-ленінскім вучэннем гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

# З РОДНАЙ ПАРТЫЯЙ МУДРАГА ЛЕНІНА

ПРАШУ СЛОВА

## ДЛЯ КАЛЕКТЫВУ

адміністрацыйна - гаспадарчай часткі універсітэта дзесятая пяцігодка была плённай. Умацавана матэрыяльна-тэхнічная база, палепшаны жыллёвыя ўмовы студэнтаў і супрацоўнікаў. Шмат намаганняў прыкладзена намі для падрыхтоўкі аб'ектаў да Алімпіяды-80. А гэта — тры інтэрнаты, тры сталовыя, студэнцкае кафэ, новы корпус біяфака.

Далейшая наша дзейнасць звязана з падрыхтоўкай да святкавання шасцідзесяцігоддзя універсітэта. Таму галоўнай задачай з'яўляецца ўдасканаленне стылю і метадаў работы.

**У. СІЛІН,**
прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце.

## НА НАШАЙ КАФЕДРЫ

існуе навукова-даследчая лабараторыя сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі. Толькі ў мінулым годзе эканамічны эфект ад укаранення навуковых распрацовак склаў больш 400 тысяч рублёў. У 1981 годзе мы мяркуем павялічыць гэту суму амаль у два разы.

За 1980 год кафедра атрымала 8 аўтарскіх пасведчанняў. А я і супрацоўнік кафедры С. Вятохін атрымалі прэмію Ленінскага камсамола Беларусі за цыкл работ па тэме «Распрацоўка сродкаў і метадаў рэгістрацыі слабых светавых сігналаў».

І яшчэ. Напярэдадні XXVI з'езда КПСС мяне прынялі ў партыю. Лічу, што гэта самая галоўная падзея ў маім жыцці.

**І. ГУЛАКОЎ,**
дацэнт кафедры агульнай фізікі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.






Літаратурны вечар, прысвечаны XXVI з'езду КПСС, прайшоў у актавай зале універсітэта. Ён ператварыўся ў сапраўднае свята беларускай літаратуры. На сустрэчу са студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ імя У. І. Леніна прыйшлі народны паэт Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы М. Танк, вядомыя паэты і празаікі: Р. Барадулін, Н. Гілевіч, І. Навуменка, І. Чыгрынаў, Я. Янішчыц. Гэта была своеасаблівая творчая справаздача беларускіх літаратараў з'езду партыі.

**НА ЗДЫМКАХ: у час літаратурнага вечара «Слова аб партыі»; аўтографы дае Ніл Гілевіч.**

**А. ЛАЗОЎСКІ.**
Фота **В. Шачака.**

ПРАШУ СЛОВА

## АНОШНІ ГОД

быў для нашага калектыву, бадай, самым знамянальным. Мы выступалі з канцэртамі ў Аўстраліі, Новай Зеландыі. І ўсюды творчасць беларускага народа і народаў нашай краіны выклікала захапленне. Зусім нядаўна «Крыжачок» удзельнічаў у канцэрце для дэлегатаў XXIX з'езда Кампартыі Беларусі. А цяпер ансамбль рыхтуецца да юбілею універсітэта.

**М. ЛАПША,**
кіраўнік народнага танцавальнага ансамбля «Крыжачок».

## У ГЭТЫЯ ДНІ

ўвага ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва звернута да Масквы, дзе праходзіць XXVI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Першая ў свеце краіна сацыялізму з'яўляецца яскравым прыкладам трыумфу ідэй вялікага Леніна, сведчаннем усёперамагаючай сілы народа, які парваў ланцугі сацыяльнага і эканамічнага заняволення і будуе камунізм.

Замежныя студэнты, што вучацца ў Савецкім Саюзе, кожны дзень пераконваюцца ў перавагах сацыялістычнага грамадскага ладу. З вялікай цікавасцю мы знаёмімся з матэрыяламі XXVI з'езда КПСС. Гэта дакументы вялікай гістарычнай важнасці. Яны сведчаць аб нястомных клопатах Камуністычнай партыі і дзяржавы аб дабрабыце савецкага народа.

Я прыехаў у Савецкі Саюз з сацыялістычнага В'етнама. Прыехаў не толькі для таго, каб набыць спецыяльнасць ці пэўную колькасць ведаў. Я вучуся ў нашых сяброў міру, дружбе, інтэрнацыяналізму — усяму таму, што дорага кожнаму сумленнаму чалавеку.

**ЗЫОНГ КІ АНЬ,**
студэнт І курса факультэта журналістыкі.

АД З'ЕЗДА ДА З'ЕЗДА

# САЛЮТ ДАСЯГНЕННЯЎ

**Адлічыла свае крокі дзесятая пяцігодка. А жывыя галасы перамог, атрыманых на яе шляху, чуюцца і ў сённяшнім дні. Яны ў высокіх сацыялістычных абавязацельствах, ударнай вучобе і працы, якой адзначаны першыя тыдні бягучага года.**

**Шмат цікавага і павучальнага назапашана за мінулае пяцігоддзе. Усё новае і перадавое атрымлівае далейшае развіццё. Аб гэтым сведчаць і расказы нашых сённяшніх субяседнікаў з фізічнага факультэта, які тройчы за пяцігодку станавіўся пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. На яго прыкладзе яскрава відаць дружны салют працоўных дасягненняў усіх падраздзяленняў універсітэта.**

**Эдуард Міхайлавіч ШПІЛЕЎСКІ, дэкан факультэта:**

— Камуністы фізічнага факультэта (а наша партыйная арганізацыя налічвае больш ста чалавек) сустрэлі чарговы з'езд партыі як найважнейшую падзею ў жыцці. І гэта не дзіўна. Партыйны форум — не толькі ацэнка спраў, пастаноўка новых задач, але і размова па шчырасці кожнага асобна ўзятага камуніста са сваім сумленнем.

Напярэдадні з'езда былі падведзены вынікі пяцігадовай працы нашага факультэта. І яны не могуць не радаваць. За час, які прайшоў ад мінулага з'езда да цяперашняга, факультэт падрыхтаваў больш 1.400 высокакваліфікаваных спецыялістаў для нашых прадпрыемстваў і каля 50 — для сацыялістычных і развіваючыхся краін. Супрацоўнікамі факультэта выдадзена 13 манаграфій, 8 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, надрукавана больш тысячы навуковых артыкулаў. Я думаю, што нядрэнным падарункам з'езду будуць і такія лічбы: за гады дзесятай пяцігодкі факультэтам пададзена 350 заяў на вынаходніцтвы, на 208 з якіх атрыманы станоўчыя рашэнні. Па гаспадарчых дагаворах з прадпрыемствамі і навуковымі ўстановамі, сярод якіх вытворчае аб'яднанне «Інтэграл», АН БССР, выканана работ на суму звыш 6,4 млн. рублёў, эканамічны эфект за пяць гадоў склаў 6,7 млн. рублёў.

Гэты колькасны пералік лічбаў і фактаў, якія адлюстроўваюць пяцігадовую дзейнасць факультэта, можна было б працягваць і далей. Але хочацца сказаць аб іншым. Студэнты і выкладчыкі значна больш увагі сталі ўдзяляць укараненню вынаходніцтваў, распрацовак у вытворчасць, павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў.

Рапартуючы з'езду аб выкананай рабоце, мы рады адзначыць, што ўсе пяць гадоў дзесятай пяцігодкі наш факультэт займае прызавыя месцы ў агульнауніверсітэцкім сацыялістычным спаборніцтве. У гэтым ёсць вялікая заслуга нашай партыйнай арганізацыі, заслуга кожнага камуніста.

У ліпені гэтага года ў Мінску адбудзецца XV Міжнародная канферэнцыя па з'явах іянізаваных газаў. Падобных мерапрыемстваў такога маштабу ў сталіцы рэспублікі яшчэ не было. На наш факультэт выпаў гонар з'яўляцца аб'ектам навуковых экскурсій канферэнцыі.

Хочацца спадзявацца, што і ў адзінаццатай пяцігодцы калектыў фізічнага факультэта будзе нязменным ініцыятарам цікавых пачынаў, з гонарам выканае рашэнні XXVI з'езда КПСС.

**Людміла ДЗЯРЖАЎСКАЯ, студэнтка І курса:**

— Чым была знамянальна асабіста для мяне дзесятая пяцігодка? Многім. Перш за ўсё — і гэта галоўнае — я паспяхова прайшла кандыдацкі стаж і ў 1978 годзе стала членам КПСС. Працуючы на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл», зразумела, што без пастаяннага папаўнення прафесійных ведаў будзе цяжка ды і проста нецікава працаваць далей. І ў мінулым годзе збылася мая мара — я стала студэнткай фізфака. Студэнцкае жыццё пачалося з будатрада. Прывезла дамоў, акрамя граматы, мноства цікавейшых успамінаў, уражанняў, задум на будучае. Цяпер рыхтуюся да новага працоўнага семестра. Мне даручана стаць камандзірам будатрада.

Студэнцкія гады толькі пачаліся. Таварышы выбралі мяне камсоргам групы... Хочацца зрабіць сваё жыццё ў сценах БДУ найбольш цікавым, карысным. А для гэтага патрэбна працаваць.

Мары на будучае? Паспяхова закончыць факультэт.

**Вячаслаў Фаміч СТЭЛЬМАХ, загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў:**

— У гэтым годзе кафедра будзе адзначаць 15-годдзе свайго існавання. Шлях—параўнаўча кароткі. За гэты час склаўся трывалы калектыў. Большасць навуковых супрацоўнікаў — ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў. Сфарміраваўся пэўны навуковы напрамак, задача якога — фундаментальныя даследаванні ўласцівасцей паўправадніковых металаў.

За пяцігодку намі праведзены шэраг работ па універсальнаму развіццю ўласцівасцей паўправадніковых металаў, распрацаваны неразбуральныя метады работы над якасцю паўправаднікоў, удасканалена тэхналогія паўправадніковых прылад. Для вырашэння гэтых задач распрацаваны некалькі даследчыцкіх установак. Акрамя таго, што гэтыя ўстаноўкі аказалі значную дапамогу вытворчасці, яны былі выкарыстаны і ў вучэбных мэтах: у іх распрацоўцы ўдзельнічалі студэнты, на іх аснове напісана некалькі дыпломных работ, праводзяцца лабараторныя заняткі. Распрацоўваем устаноўкі ў двух экземплярах: адна ўкараняецца на прадпрыемстве, другая застаецца ў вучэбным корпусе. Кафедра — ініцыятар вырашэння гэтага пытання.

У працэсе работы намі былі распрацаваны прынцыпы будовы малагабарытных спектрометраў, аналагічных якім у свеце яшчэ няма. Прылада прызначана таксама для вучэбных мэт. Мы ўжо атрымалі на яе шмат заяў ад іншых ВНУ рэспублікі. Добра вядомы і цэняцца нашы работы па фізічных уласцівасцях паўправадніковых крышталяў.

Студэнты кафедры прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай, вынаходніцкай рабоце. Прывяду ў пацвярджэнне гэтага толькі адзін факт: 80 працэнтаў студэнтаў— выпускнікоў кафедры выконваюць работы, вынікі якіх укараняюцца ў вытворчасць.

Радуе тое, што вось ужо пяты год запар наша кафедра займае першае месца на факультэце па ўсіх паказчыках. Я думаю, што гэтаму садзейнічае не толькі прэстыжнасць нашай спецыялізацыі, але штодзённая клапатлівая арганізатарская дзейнасць супрацоўнікаў кафедры. Спадзяюся, што кафедра фізікі паўправаднікоў і ў далейшым будзе ў авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва.

**Іосіф ШУМСКІ, студэнт IV курса, сакратар камсамольскай арганізацыі кафедры фізікі цвёрдага рэчыва:**

— Мой партыйны стаж — пяць гадоў. Многа, гэта ці мала? На маю думку, гэта дастатковы тэрмін для таго, каб «знайсці сябе». За гады вучобы на факультэце было шмат партыйных даручэнняў. Два гады з'яўляўся старастам патока, быў членам спортбюро факультэта, членам партбюро падрыхтоўчага аддзялення. Прызнаюся, не заўсёды і не ўсё добра атрымлівалася. Адно становіцца зразумелым: для таго, каб любая праца была паспяховай, патрэбна з найбольшай канкрэтнасцю ставіць задачы, пастарацца згуртаваць калектыў, аб'яднаць яго правільнай мэтай. Камсамольская, партыйная работа на факультэце прывучыла мяне быць праўдзівым з сябрамі, творча падыходзіць да любой справы, крытычна ўспрымаць любое адхіленне ад прынцыповасці, праўдзівасці. І, нарэшце, галоўнае, што я ўзяў для сябе за мінулыя гады, — гэта ўпэўненасць у сваіх сілах, у сваіх магчымасцях, жаданне быць не пасіўным назіральнікам у жыцці, а яго актыўным пераўтваральнікам.

**Запісаў В. САБАЛЕЎСКІ.**

# КРОЧЫЦЬ У ЗАЎТРА МАЁ ПАКАЛЕННЕ

**Кафедра — асноўнае звяно вышэйшай школы, якое вызначае змест і адзінства вучэбнага, метадычнага, навуковага і выхаваўчага працэсаў.**
**Аб дасягненнях кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі наш расказ.**

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

## На рахунку—здабыткі

РАЗМОВУ загадчык кафедры, доктар філалагічных навук, прафесар Б. В. Стральцоў пачаў са знаёмства са стэндам аб выдавецкай дзейнасці калектыву, адначасова называючы лічбу за лічбай... Гаварыць ёсць аб чым. Агульны аб'ём друкаванай прадукцыі кафедры склаў больш як 42 друкаваныя аркушы. За 1976—1980 гады тут распрацаваны праграмы курсаў «Уводзіны ў журналістыку» (дацэнт Т. Д. Арлова), «Журналісцкае майстэрства» (выкладчык І. І. Беленькі), спецкурсаў «Нарыс і фельетон» (прафесар Б. В. Стральцоў), «НТР і перадавы вопыт у друку» (прафеср В. А. Пыжкоў) і іншыя.

Сярод асноўных напрамкаў навуковых даследаванняў на кафедры выдзяляюцца два: «Праблематыка газетных выступленняў» і «Шляхі павышэння якасці і эфектыўнасці газетнай графікі». Рукапіс па газетнай графіцы падрыхтаваны да друку А. В. Балашам. А выданне дапаможніка «Праблематыка газетных выступленняў» — плён творчасці ўсіх супрацоўнікаў кафедры. Першая яго частка, у якой даследавана работа ідэалагічных аддзелаў, выйшла ў выдавецтве Белдзяржуніверсітэта ў 1980 годзе. Другая частка, прысвечаная аналізу дзейнасці эканамічных аддзелаў, праблемам савецкага і культурнага будаўніцтва, сацыялістычнага быту, падрыхтавана да друку.

Навукова-даследчай рабоце студэнтаў таксама адводзіцца значнае месца. Пры кафедры дзейнічаюць два навуковыя гурткі: публіцыстыкі і літаратурна-мастацкай крытыкі. Вынік іх працы: 24 студэнцкія работы прадстаўлены ў 1980 годзе на рэспубліканскі агляд-конкурс. Сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя на дзесятую пяцігодку, калектыў кафедры значна перавыканаў. Сярод няпланавых распрацовак — манаграфіі Б. В. Стральцова «Дзесятая пяцігодка ў беларускім нарысе», Е. Л. Бондаравай «Кінастужка даўжынёю ў жыццё», шматлікія артыкулы іншых супрацоўнікаў.

Зразумелая ўвага кафедры да падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Асноўная яе форма — праца над дысертацыйнымі даследаваннямі. Выкладчык В. М. Куцэнка закончыў работу над кандыдацкай дысертацыяй. Дапрацоўвае сваё даследаванне ў галіне тэхнікі афармлення газеты А. В. Балаш.

Калектыў кафедры дастойна пачаў адзінаццатую пяцігодку, маючы на рахунку плённыя здабыткі, пастаянна расшыраючы свае творчыя гарызонты.

**М. ЛАХВІЧ.**



**Кафедра ядзернай фізікі лічыцца адной з лепшых ва універсітэце. У дасягненні кафедры значны ўклад унеслі яе загадчык, прафесар С. С. Шушкевіч і дацэнт В. Я. Ямны.**
**Фота В. ШАЧАКА.**

ЧАС СТВАРЭННЯ: ДЗЕСЯТАЯ ПЯЦІГОДКА

## Два гады станаўлення

**Навукова - даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем створаны 1 сакавіка 1978 года. Расказвае дырэктар інстытута, член - карэспандэнт АН БССР, прафесар Вадзім Васільевіч Свірыдаў:**

— Калектыў інстытута ў 1980 годзе значна расшырыў і паглыбіў сувязі з прамысловасцю. Эканамічны эфект ад укаранёных работ склаў больш 1 мільёна 100 тысяч рублёў, або 1,5 рубля на 1 рубель затрат.

Значных поспехаў дабіўся інстытут у прамысловым асваенні распрацовак новай тэхналогіі цэлюлозных валокнаў, якія выключаюць забруджванне навакольнага асяроддзя. Была выпушчана першая доследная партыя валокнаў па распрацаванай у нас тэхналогіі. На іх аснове створаны новыя лекавыя прэпараты ў выглядзе марлі, ваты, мазяў, якія ўяўляюць сабой вытворчыя цэлюлозы. Прэпараты прайшлі паспяховую праверку ў медыцынскіх установах рэспублікі.

Па распрацоўках інстытута ў 1980 годзе падрыхтавана вопытна-прамысловая партыя фотапласцін, якія не ўтрымліваюць серабра. Выклікаюць цікавасць работы інстытута па радыяцыйна- ферментатыўнай апрацоўцы грубых кармоў. Выкананне гэтай работы паклала пачатак сувязям інстытута з сельскай гаспадаркай.

Нядаўна былі падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж лабараторыямі інстытута. Першае месца заняла лабараторыя высокатэмпературных рэакцый (загадчык — дацэнт А. І. Лясніковіч).

Наперадзе — гады новых адкрыццяў, гады натхнёнай працы і творчых пошукаў.

# ТВАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ





ШМАТ прыйшлося папрацаваць сектару грамадска-палітычнай практыкі і Ленінскага заліку камітэта камсамола і савету па ГПП факультэта журналістыкі, рыхтуючыся да атэстацыі. Папершае, трэба было правесці тлумачальную работу са студэнтамі першага курса. Расказаць, як скласці асабісты комплексны план, напісаць рэферат, выступіць з лекцыямі. Старшынёй савета па ГПП факультэта дацэнтам П. І. Бондарам былі распрацаваны новыя палажэнні, якія ўлічваюцца пры абмеркаванні выніковай адзнакі студэнта па ГПП. Яны складзены з улікам спецыфікі вучобы на нашым факультэце.

Напярэдадні атэстацыі ў групах прайшлі камсамольскія сходы «Твая жыццёвая пазіцыя». Асаблівая ўвага ў гэтым годзе была ўдзелена лекцыйнай рабоце студэнтаў. На факультэце створана група для правядзення гутарак і лекцыйнай работы ў падшэфным Мінскім фінансава-эканамічным тэхнікуме. У час зімовых канікулаў кожны камсамолец выступіў перад рабочымі, калгаснікамі і вучнямі сярэдніх школ з лекцыямі і гутаркамі аб БДУ імя У. І. Леніна.

Атэстацыя камсамольскіх груп праходзіла ў метадычным кабінеце па ГПП, аформленым самімі студэнтамі.

**Л. БЕРДНІК,**
**адказная за сектар ГПП і Ленінскага заліку журфака.**

**НА ЗДЫМКАХ:** ідзе атэстацыя на журфаку.

Фота В. Шачака.

# Складаемыя поспеху

МАСКВА. Кастрычнік 1961 года... Уся краіна сачыла за работай вышэйшага форуму камуністаў Краіны Саветаў — XXII з'езда КПСС. Ён увайшоў у гісторыю нашай партыі і Айчыны як з'езд, які прыняў велічную праграму будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Усім сэрцам успрынялі рашэнні XXII з'езда КПСС і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адразу ж пасля з'езда прайшлі камсамольскія сходы, сустрэчы з яго дэлегатамі. 15 снежня 1961 года з удзелам камсамольскага актыву адбыўся пленум камітэта камсамола, які вызначыў асноўныя напрамкі, задачы універсітэцкай арганізацыі па выкананню рашэнняў партыі. «Моладзь нашага універсітэта,— падкрэслівалася ў пастанове пленума, —поўная рашучасці ажыццявіць планы партыі, аддаць усе свае сілы і веды вялікай справе пабудовы камунізму».

Два апошнія дзесяцігоддзі— гэта гады бурнага развіцця універсітэта. Ствараліся новыя факультэты, аддзяленні, кафедры, навукова-даследчыя інстытуты і лабараторыі. Разам з універсітэтам расла і яго камсамольская арганізацыя. Калі ў 1961 годзе яна налічвала ў сваіх радах тры тысячы членаў Ленінскага камсамола, а ў 1965 — пяць тысяч, то ў 1976 годзе дасягнула 11 тысяч чалавек.

Дзейнасць любой камсамольскай арганізацыі, яе аўтарытэт у многім вызначаюцца ўзроўнем работы, адносінамі да справы яе кіраўнікоў, якасцю і колькасцю яе актыву. Не складае выключэння ў гэтым і камсамольская арганізацыя універсітэта. Яе дзейнасць у апошнія дзесяцігоддзі характарызуецца добра бачнай тэндэнцыяй павышэння ўвагі да падбору актыву, паляпшэння яго якаснага саставу, паяўленнем новых форм навучання і выхавання. Вялікі станоўчы ўплыў на гэты працэс аказала адкрыццё ў 1969 годзе ва універсітэце падрыхтоўчага аддзялення (рабфака, як яго адразу ж па аналогіі з рабочымі факультэтамі 20-х гадоў назвалі студэнты). З гэтага часу рады актыву сталі ў значнай ступені папаўняцца за лік юнакоў і дзяўчат, якія прайшлі школу ў працоўных калектывах заводаў і фабрык, калгасаў і саўгасаў, у арміі і на флоце. У 1975 годзе, напрыклад, з амаль 400 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення было 170 рабочых, 180 — дэмабілізаваных воінаў, каля 50 калгаснікаў. 115 з іх былі камуністамі, больш чым 50 — ударнікамі камуністычнай працы. Уліваючыся ў рады вузаўскага камсамольскага актыву, яны прыносілі з сабой адказныя адносіны да справы, добрае бачанне перспектывы і рэальных жыццёвых праблем. Ужо праз год-два многія з іх станавіліся на чале факультэцкіх камсамольскіх арганізацый, уваходзілі ў састаў камітэта камсамола універсітэта і факультэтаў.

Хочацца сказаць і аб такой магчымасці падбору, навучання і выхавання актыву, як студэнцкі будаўнічы рух. Сёння ва універсітэце, бадай, немагчыма знайсці сакратара камсамольскай арганізацыі факультэта, курса, акадэмічнай групы, чые здольнасці і правы весці за сабой іншых не былі б выпрабаваны на асялку СБА. Студэнцкі будаўнічы атрад дае цудоўныя магчымасці для праверкі і выхавання такіх якасцей чалавека, як уменне будаваць свае адносіны з таварышамі, здольнасць знаходзіць выхад з нечаканых становішчаў, пераадольваць цяжкасці, і шэрагу іншых.

У 60-я—70-я гады ў радах камсамольскага актыву універсітэта прайшлі цудоўную школу тысячы студэнтаў, якія сталі затым здольнымі кіраўнікамі і выхавацелямі.

У 1963 годзе, скончыўшы сярэднюю школу, прыйшла на першы курс матэматычнага факультэта семнаццацігадовая Вера Прокашава. Ужо ў першыя тыдні вучобы яна звярнула на сябе ўвагу сваіх таварышаў — сваёй энергіяй, мэтанакіраванасцю, дапытлівасцю. Восенню гэтага ж года Веру выбралі ў састаў камітэта камсамола факультэта і універсітэта, дзе яна адразу ўключылася ў шэфскую работу. У саставе камітэта камсамола універсітэта Вера працавала чатырнаццаць гадоў! Хутка ішоў час. Яна паспяхова закончыла універсітэт, была пакінута на факультэце для выкладчыцкай работы. І ўсе гэтыя гады яна была ў віры камсамольскіх спраў: у 1967—70 і ў 1974—77 гадах была выбрана сакратаром камітэта камсамола факультэта, на чале турысцкіх груп пабывала ў самых аддаленых кутках краіны, прайшла шлях ад байца да камандзіра шматтысячнага зводнага СБА Беларусі ў Малдавіі.

І зараз выкладчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Вера Акімаўна Прокашава нязменны ўдзельнік і арганізатар шматлікіх спраў універсітэцкага камсамола.

Эфектыўным сродкам выхавання заўсёды было камсамольскае даручэнне. Як прыцягнуць да грамадскай работы максімальную колькасць студэнтаў, як выбраць кожнаму заняткі па душы, зрабіць камсамольскае даручэнне не толькі цікавым, але і патрэбным — гэтыя пытанні пастаянна хвалявалі камітэт камсамола, увесь камсамольскі актыў універсітэта. «Даць кожнаму даручэнне — рэч не цяжкая, —пісаў у сваім артыкуле «Актыў? Пасіў? Лепш без падзелу» ў 1965 годзе намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта М. Ціва.—Але ці гэтым узнімеш актыўнасць? Неабходна паставіць перад кожнай групай вялікую мэту, якая б захапіла ўсіх... вызначыць канкрэтнае месца кожнаму камсамольцу, даць яму даручэнне, пасля правераць, як ён яго выконвае,—толькі такім чынам мы можам пазбавіцца ад усемагчымых сераднякоў, пасіўных».

У красавіку 1960 года шматтыражка «Беларускі універсітэт» у справаздачы аб адбыўшайся 27 сакавіка XIV камсамольскай канферэнцыі універсітэта пісала, што многія дэлегаты ў сваіх выступленнях выказвалі думку аб тым, што кожны студэнт «павінен набыць якую-небудзь грамадскую спецыяльнасць. Прыбыўшы на месца работы, ён павінен умець аказаць уплыў на дзейнасць грамадскіх арганізацый». Такім чынам, у асяроддзі студэнцкага актыву фарміравалася разуменне неабходнасці не толькі «даць даручэнне» кожнаму, але і зрабіць гэта даручэнне грамадска значным, і не толькі ў сценах ВНУ, але і пасля яго заканчэння. Грамадскае даручэнне перарастае ў якасна новую з'яву — грамадскую спецыяльнасць. Але спецыяльнасці патрэбна вучыць. Так у вышэйшых навучальных установах краіны ўзнікаюць факультэты грамадскіх прафесій. Ва універсітэце ФГП быў створаны ў 1963 годзе па ініцыятыве камітэта камсамола. Спачатку факультэт складаўся з чатырох аддзяленняў і рыхтаваў кіраўнікоў танцавальных калектываў, хормайстраў, дырыжораў аркестраў рускіх народных інструментаў, рэжысёраў самадзейных тэатральных калектываў. Усе аддзяленні працавалі на базе адпаведных універсітэцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці.

Ішлі гады. І з кожным годам факультэт набіраў сілу, заваёўваў аўтарытэт і папулярнасць. Ствараліся новыя аддзяленні: лектарска - прапагандысцкае, арганізатараў грамадска-палітычнай работы, арганізатараў ваенна-патрыятычнага выхавання, грамадскіх суддзяў і інструктараў па спорту... У 1979 годзе на 10 аддзяленнях ФГП займалася ўжо 935 чалавек.

РАСКАЗВАЮЧЫ аб рабоце па арганізацыйнаму і ідэйнаму ўмацаванню камсамольскіх радоў, нельга не спыніцца на дзвюх вялікіх кампаніях па абмену камсамольскіх дакументаў, якія прайшлі ў 1967-68 і ў 1975-76 гадах. Нягледзячы на вялікую дадатковую нагрузку, якая лягла на плечы актыву ў гэтыя гады, і адна і другая кампаніі аказалі плённы ўплыў на ўсе бакі і напрамкі дзейнасці арганізацыі: значна павысілася грамадска-палітычная актыўнасць студэнцтва, узровень арганізацыі і правядзення розных мерапрыемстваў; у гэтых кампаніях хутка раслі і фарміраваліся ў ініцыятыўных, здольных арганізатараў камсамольскія актывісты.

Права першымі абмяняць камсамольскія дакументы было прадастаўлена лепшым камсамольскім арганізацыям: аддзяленню палітычнай эканоміі гістфака і 17-й групе 4-га курса фізічнага факультэта (сакратары Тацццяна Цахановіч і Міхаіл Самец). У ліку першых камсамольскія дакументы атрымалі лепшыя студэнты універсітэта, камсамольскія актывісты, імянныя стыпендыяты.

У ходзе абмену павысілася паспяховасць студэнтаў, з 89 да 93 вырас працэнт камсамольцаў, якія мелі пастаянныя грамадскія даручэнні. А чатыры працэнты ва ўмовах універсітэта — гэта больш 400 чалавек. Значна палепшылася індывідуальная работа з членамі ВЛКСМ. За перыяд абмену ў камітэтах камсамола, бюро з 3547 камсамольцамі былі праведзены індывідуальныя гутаркі, якія далі камсамольскаму актыву багаты матэрыял для роздуму, удасканалення сваёй работы.

Абмен дакументаў нарадзіў цікавыя пачыны. Так, па ініцыятыве камсамольскіх арганізацый ФПМ, фізічнага, хімічнага факультэтаў не толькі ва універсітэце, але і ў шэрагу іншых ВНУ рэспублікі разгарнулася спаборніцтва камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!». У ходзе падрыхтоўкі да абмену ва універсітэце ўзнікла такая форма студэнцкага будаўнічага руху, як зімовыя СБА (для работы ў перыяд зімовых канікулаў). Першы такі атрад быў створаны ў снежні 1974 года на гістарычным факультэце. У студзені 1976 года камітэтам камсамола універсітэта быў створаны зімовы студэнцкі будаўнічы атрад імя XXV з'езда КПСС. 25 яго байцоў працавалі на ўдарнай камсамольскай будоўлі Мінскай вобласці — будаўніцтве Волжынскага СПТВ меліяратараў. Гэты пачын таксама быў шырока падхоплены ў вузаўскіх камсамольскіх арганізацыях. Сёння ў камсамольскай арганізацыі універсітэта зімовыя СБА эфектыўна выкарыстоўваюцца і як школа падрыхтоўкі кіраўнікоў летніх працоўных семестраў.

УСЕ гэтыя гады надзейным памочнікам камітэта камсамола, прапагандыстам усіх яго пачынанняў, дасягненняў была шматтыражная газета «Беларускі універсітэт». На яе старонках рэгулярна выступалі сакратары камітэта камсамола універсітэта, камсамольскія актывісты. Газета расказвала аб лепшых камсамольскіх арганізацыях, лепшых камсамольцах.

І, канешне, вялікую ролю ва ўсіх поспехах і дасягненнях універсітэцкай камсамоліі адыгралі і адыгрываюць удумлівае кіраўніцтва, пастаянная ўвага і падтрымка парткома, партыйных арганізацый факультэтаў, усіх камуністаў універсітэта. Чытаючы дакументы, якія ўжо сталі ўласнасцю архіваў, гартаючы падшыўкі «Беларускага універсітэта», гаворачы з ветэранамі камсамольскай арганізацыі, яшчэ раз яскрава ўсведамляеш, якое вялікае значэнне ў дзейнасці камсамола, у станаўленні яго актыву мелі і маюць гэтая ўвага, клопат і падтрымка.

Такім чынам, умелае партыйнае кіраўніцтва, пастаяннае ўдасканаленне ўнутрысаюзнай работы, пошук новых форм і метадаў прыцягнення студэнцтва да актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці, клапатлівае навучанне і выхаванне актыву з'явіліся важнай, абавязковай умовай здзяйснення тых слаўных спраў, дасягненняў і поспехаў, з якімі камсамольская арганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прыйшла да свайго шасцідзесяцігоддзя.

**А. ТОЗІК,**
**кандыдат гістарычных навук, былы сакратар камітэта камсамола універсітэта.**

# ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у №№ 4, 6, 7 за 1981 год).**

**1930 год**

**Май**

Адбыўся першы выпуск вячэрняга рабочага універсітэта. 80 лепшых студэнтаў пасланы ў ВНУ БССР, 24 — на калгаснае будаўніцтва, 1 — у апарат Наркамасветы.

**Снежань**

На базе рабфака БДУ створаны тры рабфакі: пры хіміка-тэхналагічным, будаўнічым інстытутах і пры універсітэце.

**Май**

Камсамольцы універсітэта (700 чалавек) пастанавілі адлічыць ад стыпендыі 1 працэнт для аказання дапамогі ахвярам фашызму.

**3 верасня**

Калектыў Будаб'яднання на 12 дзён раней тэрміну скончыў будаўніцтва універсітэцкага гарадка.

**Снежань**

Універсітэт меў у сваім саставе 6 факультэтаў: рабочы, медыцынскі, педагагічны, народнай гаспадаркі, хіміка-тэхналагічны, савецкага права і будаўніцтва.

**Снежань**

Устаноўлена стыпендыя імя Янкі Купалы на літаратурным аддзяленні педфака.

**Снежань**

Закладзены батанічны сад універсітэта.

**1931 год**

**Май**

Калегія Наркамасветы пастанавіла стварыць на базе БДУ 5 самастойных інстытутаў.

**Ліпень**

Прынята пастанова ЦВК і СНК БССР аб 10-годдзі БДУ, у якой адзначаецца, што за гэты час ім падрыхтавана 3 тысячы спецыялістаў, на базе БДУ створана 12 ВНУ і шэраг даследчыцкіх інстытутаў.

**25 лістапада**

Пасля рэарганізацыі ва універсітэце засталося 436 студэнтаў, у тым ліку 63 — на вячэрнім аддзяленні. На фізмаце — 218 чалавек (27 — на вячэрнім), на біяфаку 105 (36— на вячэрнім), на хімфаку 113.

**Май**

На педфаку створана газетна-выдавецкае аддзяленне з кантынгентам студэнтаў 50 чалавек.

**Кастрычнік**

Выйшаў № 1 газеты «За пралетарскія кадры».

**1932 год**

Створана кафедра марксізму-ленінізму, якая аб'яднала прафесарска-выкладчыцкі састаў усіх грамадскіх навук.

**1934 год**

**1 верасня**

Ва універсітэце адкрыты гістарычны факультэт.

**Кастрычнік**

Выйшаў № 1 газеты «За бальшавіцкую гісторыю», які прысвечаны адкрыццю гістарычнага факультэта.

**1935 год**

**Студзень**

Адбылася першая Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў, якая падвяла вынікі работы па рэалізацыі пастановы ЦК ВКП(б) аб выкладанні гісторыі ў школе. На канферэнцыі выступілі прафесары Н. М. Нікольскі, У. І. Пічэта і іншыя.

**22 мая**

Выйшаў № 2 універсітэцкай газеты «За ленінскія кадры».

**(Працяг будзе).**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

26 лютага 1981 г.
Заказ 348. АТ 02113

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ